УДК 069.8(083.9)(476)

# ПРАЕКТЫ МУЗЕЯЎ У ГОД ГІСТАРЫЧНАЙ ПАМЯЦІ

***В. В. Навіцкая,*** *саіскальнік вучонай ступені кандыдата навук установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», намеснік дырэктара па навуковай і адукацыйнай справе ўстановы «Музей "Замкавы комплекс "Мір""», г. п. Мір*

**Анатацыя.** У артыкуле разгледжаны праекты дзяржаўных музеяў Беларусі, прымеркаваныя да Года гістарычнай памяці і якія на дадзены момант лічацца рэалізаванымі. Гэта часовыя экспазіцыі, культурныя і патрыятычныя акцыі, VR-рэканструкцыі, музейныя заняткі і іншыя мерапрыемствы, якія дазваляюць павысіць уцягнутасць маладога пакалення ў кантэкст культуры і гісторыі Беларусі з мэтай захавання нацыянальных культурных каштоўнасцей, гістарычнай праўды і памяці аб гераічным подзвігу беларускага народа.

**Ключавыя словы:** музей, Год гістарычнай памяці, гістарычная праўда, генацыд беларускага народа.

# MUSEUM PROJECTS IN THE YEAR OF HISTORICAL MEMORY

***O. Novitskaya,*** *Candidate of Science Degree of Educational Institution «Belarusian State University of Culture and Arts», Deputy Director for Scientific and Educational Affairs of the Institution «Museum "Castle complex "Mir""», Mir*

**Abstract.** The article discusses the projects of the state museums of Belarus, dedicated to the Year of Historical Memory and deemed to be completed. They include temporary exhibitions, cultural and patriotic events, VR-reconstructions, museum classes and other activities that allow to increase the involvement of the young generation in the context of the culture and history of Belarus with the aim of preserving national cultural values, historical truth and memory of the heroic feat of the Belarusian people.

**Keywords:** museum, Year of Historical Memory, historical truth, genocide of the Belarusian people.

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі 2022 г. аб'яўлены Годам гістарычнай памяці. У Рэспубліканскі план мерапрыемстваў па яго правядзенні былі ўключаны мерапрыемствы па ўвекавечанні памяці ахвяр генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, захаванні гістарычнай праўды і памяці аб гераічным подзвігу беларусаў, папулярызацыі гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыны, захаванні і ўвекавечанні памяці аб выбітных асобах, якія ўнеслі ўклад у развіццё Айчыны, а таксама мерапрыемствы, накіраваныя на ўмацаванне адзінства беларускага народа і беларускай дзяржаўнасці.

Асобная роля ў рэалізацыі пастаўленых задач у гэтым напрамку адведзена музейным установам, якія з'яўляюцца аднымі з важных каналаў распаўсюджвання рэтраспектыўнай інфармацыі і цэнтраў патрыятычнага выхавання.

У дадзеным артыкуле пералічваюцца і аналізуюцца праекты, прысвечаныя Году гістарычнай памяці, такіх дзяржаўных музеяў гістарычнага профілю, як Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь [4], Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны [2], Мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой» [3] і Гродзенскі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі [1]. Інфармацыя аб гэтых праектах была размешчана на старонках іх афіцыйных сайтаў.

У гэтых установах былі праведзеныя культурныя і патрыятычныя акцыі, часовыя экспазіцыі, VR-рэканструкцыі, музейныя заняткі, квізы, конкурсы, дабрачынныя мерапрыемствы, якія дазволілі павысіць уцягнутасць маладога пакалення ў кантэкст культуры і гісторыі Беларусі для захавання нацыянальных культурных каштоўнасцей, гістарычнай праўды і памяці аб гераічным подзвігу беларусаў.

Важнай падзеяй гэтага года з'явілася адкрыццё 21 лютага 2022 г. у Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны часовай экспазіцыі «Генацыд беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны». Менавіта яна стала своеасаблівым эталонам і прадэманстравала іншым музеям, у якім напрамку трэба ісці каб стварыць падобныя праекты ў сваіх установах і ў маштабах усёй краіны прадэманстраваць злачынствы, накіраваныя на планамернае фізічнае знішчэнне насельніцтва Беларусі. Паступова ўсе музейныя ўстановы падтрымалі гэту ідэю, у т. л. і вядучыя музеі гістарычнага профілю. Так, 29 красавіка адбылося адкрыццё часовай экспазіцыі «Нельга забыць» у Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь, 4 мая – «Мы памятаем…» у Мемарыяльным комплексе «Брэсцкая крэпасць-герой».

Пры падрыхтоўцы дадзеных часовых экспазіцый у супрацоўнікаў музеяў была магчымасць выкарыстоўваць інтэрнэт-праекты, распрацаваныя дзяржаўнымі архівамі і размешчаныя ў адкрытым доступе: «Партызаны Беларусі» (https://partizany.by/), «Беларускія вёскі, спаленыя ў гады Вялікай Айчыннай вайны» (https://db.narb.by/), «Афіцыйныя геральдычныя сімвалы Рэспублікі Беларусь» (https://gs.archives.gov.by/), віртуальную галерэю памяці вядомых людзей і важных падзей у гісторыі Беларусі, падрыхтаваную Беларускім дзяржаўным архівам кінафотафонадакументаў (https://www.youtube.com/channel/UCu1uyktVZh358JOnaUF9QFQ).

Акрамя часовых экспазіцый, прысвечаных генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, у бягучым годзе музеямі гістарычнага профілю былі падрыхтаваны і іншыя экспазіцыйныя праекты, прысвечаныя не толькі ваеннай тэматыцы, але і ўвогуле гісторыі Беларусі. Да іх ліку можна аднесці наступныя: «Брэсцкая крэпасць. Дарогамі памяці» (сумесны праект Мемарыяльнага комплексу

«Брэсцкая крэпасць-герой» і Нацыянальнага музея Рэспублiцы Карэлія), «Сабібор. Вяртанне подзвігу Аляксандра Пячэрскага», «Памяць народа. Вялікая Айчынная вайна ў мастацтве», «Лёс Музея – Лёс Краіны. Шлях даўжынёю ў стагоддзе», «Ніколі больш», прымеркаваная да Міжнароднага дня памяці ахвяр Халакоста, «Лічбы на сэрцы», «Адзінства народаў – залог Вялікай Перамогі», «Сімвалы блакаднага Ленінграда» (сумесны праект Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Дзяржаўнага мемарыяльнага музея абароны і блакады Ленінграда, Цэнтральнага дзяржаўнага архіва літаратуры і мастацтва Санкт-Пецярбурга), «Нябачнае захаванае», віртуальны тур Нацыянальнага гістарычнага музея «Беларусь і беларусы. Гід па гісторыі і культуры», віртуальны праект «Рэха мінулай вайны» (сумесны праект Нацыянальнага гістарычнага музея і Музея сучаснай гісторыі Расіі) і інш.

Перасовачная экспазіцыя Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны «Лёс краіны – лёс чалавека» ў рамках патрыятычнай акцыі «Дарога памяці» з'явілася ўдалым спалучэннем фондавых матэрыялаў і спецыяльных мультымедыйных праграм, а таксама дазволіла азнаёміць з асноўнымі вехамі вайны жыхароў Гомеля, Жодзіна, Барысава, Магілёва, Брэста, Шчучына і іншых гарадоў Беларусі.

Цікавы варыянт узаемадзеяння з дзіцячай і моладзевай аўдыторыяй прапанавалі ў Мемарыяльным комплексе «Брэсцкая крэпасць-герой» у выглядзе правядзення Конкурсу чытальнікаў ваеннай паэзіі «Аб героях былых часоў» сярод навучэнцаў устаноў г. Брэста (ад 6 да 25 гадоў). У выніку ў конкурсе прынялі ўдзел 130 чалавек, 13 з іх атрымалі Гран-пры. Удзельнікі конкурсу мовай паэтычных вобразаў змаглі паказаць, што вайна, з аднаго боку, гэта час страт і болі, а з другой – час мужнасці і самаахвярнасці для будучай Перамогі.

Выклікала пэўную зацікаўленасць і пастаноўка «Дарогай дзіцячых слёз…», якая прайшла ў Брэсцкай крэпасці 21–22 чэрвеня. Яна была падрыхтавана ўзорнай тэатральнай студыяй «Чароўны ліхтар» і прадстаўляла сабой паказы пластычнай візуалізацыі, прысвечаныя загінуўшым у Другой сусветнай вайне 13 млн дзяцей.

Для дзіцячай аўдыторыі ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў гэтым годзе быў прапанаваны новы музейны занятак «Музычная культура ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны», у аснову якога ляглі рэдкія матэрыялы з фондавай калекцыі музея. Занятак дазваляе дзецям паглядзець на гістарычныя падзеі праз прызму мастацтва.

На сучасным этапе музеі актыўна выкарыстоўваюць свае старонкі ў сетцы Інтэрнэт для рэалізацыі пастаўленых задач па патрыятычнаму выхаванню. Так, напрыклад, у сацыяльнай сетцы Instagram на працягу 18 дзён красавіка праходзіў квіз «Брэсцкая крэпасць. Гісторыя. Сучаснасць. Будучыня». 80 адабраных удзельнікаў адказвалі на пытанні і

выконвалі заданні па гісторыі Брэсцкай крэпасці, даведваліся пра новыя цікавыя факты, праходзілі творчыя этапы.

Яшчэ адзін варыянт прыцягнення цікавасці да вывучэння гісторыі і пагружэння ў гераічнае мінулае быў прапанаваны ў Брэсцкай крэпасці. Унікальная VR-рэканструкцыя «Невядомы сцяганосец», распрацаваная і прадстаўленая Міжнародным інфармацыйным агенцтвам «Расія Сёння» ў Рэспубліцы Беларусь, дазволіла любому ўдзельніку ў пэўныя дні мая і чэрвеня самому стаць «невядомым сцяганосцам» і прайсці шлях з чырвоным сцягам у руках па даху рэйхстага. Пры падрыхтоўцы дадзенага праекта была выкарыстана вялікая колькасць фотаздымкаў, чарцяжоў і планаў будынка рэйхстага, гістарычных дакументаў і рэальных успамінаў. У выніку перадавыя візуальныя тэхналогіі дазволілі адчуць «эфект прысутнасці».

У Год гістарычнай памяці ў некаторых беларускіх музеях гістарычнага профілю ўжо прайшлі навуковыя і навукова-практычныя канферэнцыі, галоўнай задачай у правядзенні якіх стала кансалідацыя дзейнасці гісторыкаў і музейшчыкаў, а таксама грамадскасці па захаванні гістарычных помнікаў і культурнай спадчыны. Гэта «Актуальныя пытанні захавання гістарычных помнікаў. Брэсцкая крэпасць: вехі гісторыі, выпрабаванняў, развіцця» (г. Брэст), «Labor omnia vincit II (праца заўсёды перамагае): матэрыяльная культура ў гістарычным кантэксце. Праблемы вывучэння і захавання» (г. Гродна).

Амаль усе музеі Беларусі падтрымалі прапанаваную Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь патрыятычную акцыю да Дня Перамогі «Ніхто не забыты, нішто не забыта» з прадастаўленнем права наведвання экспазіцый 8 і 9 мая 2022 г. бясплатна для ўсіх катэгорый наведвальнікаў. Прыняць удзел у гэтай акцыі змаглі не толькі жыхары Беларусі, але і турысты з іншых краін.

Кансалідацыя розных устаноў і аб’яднанняў дазваляе рэалізоўваць цікавыя сумесныя праекты рознай накіраванасці. Гаворка ідзе пра дабрачыннае мерапрыемства «5-ы форт», якое было праведзена ў Мемарыяльным комплексе «Брэсцкая крэпасць-герой» у рамках праектаў рэспубліканскага грамадскага аб’яднання «Патрыёты Беларусі», Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі і мастацкай галерэі-салона «АртХаос», прымеркаваных да Года гістарычнай памяці. Мерапрыемству папярэднічаў арт-праект «Брэст пэндзлем нашчадкаў», які праходзіў у маі на тэрыторыі комплексу і ўдзел у якім змаглі прыняць як навучэнцы каледжа мастацтваў, так і прафесійныя мастакі. Створаныя карціны былі прадстаўлены на часовай экспазіцыі ў музеі, дзе кожны мог набыць упадабаную працу. Грошы ад продажу карцін будуць выкарыстаны для рэканструкцыі музея «Форт № 5».

Такім чынам, аналіз афіцыйных сайтаў такіх дзяржаўных музеяў гістарычнага профілю, як Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь, Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны,

Мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой» і Гродзенскі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі, дазволіў прадэманстраваць рэалізаваныя гэтымі ўстановамі праекты ў Год гістарычнай памяці, падкрэсліць важнасць развіцця патрыятычных пачуццяў у падрастаючага пакалення, захавання гістарычнай праўды і памяці аб гераічным подзвігу беларускага народа, папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны.

*1.* Мероприятия [Электронный ресурс] // Официальный сайт Гродненского государственного музея истории религии. – Режим доступа: https://muzej.by/?page_id=141. – Дата доступа: 10.09.2022.

*2.* Новости [Электронный ресурс] // Официальный сайт Белорусского государственного музея истории Великой Отечественной войны. – Режим доступа: http://www.warmuseum.by/news/. – Дата доступа: 10.09.2022.

*3.* Новости [Электронный ресурс] // Официальный сайт Мемориального комплекса «Брестская крепость-герой». – Режим доступа: https://www.brest-fortress.by/novosti. – Дата доступа: 10.09.2022.

*4.* Официальный сайт Национального исторического музея Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://histmuseum.by/ru/. – Дата доступа: 10.09.2022.